**РАБОТНІКІ НАВУКІ І ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ! ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА ДАЛЕЙШЫ РОСКВІТ НАВУКІ, ЗА ТЭХНІЧНЫ ПРАГРЭС! РЫХТУЙЦЕ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ, ВАРТЫХ ЭПОХІ КАМУНІЗМА! СЛАВА ПЕРАДАВОЙ САВЕЦКАЙ НАВУЦЫ!** (З заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая)





Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 12—13 (601) | Пятніца, 30 красавіка 1965 г. | Год выдання XVIII | Цана 1 кап.


## МАЙ СТУДЭНЦКІ

### Фотарэпартаж

Май—свята вясны, цяпла, веселля. Куды цяпер ні глянь—усюды ўсмешкі, песні.

Часцей стала паказвацца вялікае, чыстае і радаснае сонца. Прыкметна ажывае зямля. Голыя дрэўцы пачалі налівацца сілай вясновай бадзёрасці, раскрываючы свае пяшчотныя язычкі лісцяў. Усюды будуюць гнёзды гаманлівыя птушкі.

Вясна і Май—прадвеснікі поспехаў і перамог народа — уласна крочаць па планеце...

Май заглянуў у нашы студэнцкія аўдыторыі, навуковыя кабінеты, на спартыўныя пляцоўкі і лабараторыі, у сэрцы людзей.

А які ж ён, наш студэнцкі Май?

Адказаць на гэтае пытанне дапамаглі фотакамеры. Колькі радасці, усмешак убачылі мы! Вось як у гэтай, сустрэўшай нас дзяўчыны. Завуць яе Ніна Царэнка, з філалагічнага факультэта. Менавіта, Ніна, відаць, многае ведае аб прыходзе Першамая да студэнтаў, бо, як высветлілася пазней, яна з'яўляецца членам камітэта камсамола універсітэта. Але расказаць аб усім ёй не хапае часу, яшчэ шмат чаго трэба зрабіць да свята. Твар Ніны свяціўся такой светлай, вясёлай ўсмешкай, што мы міжволі ўспомнілі пра свае фотакамеры. Наш першы здымак атрымаўся такім, якім вы яго бачыце зараз на гэтай старонцы...

Мы накіроўваемся на другі факультэт, выконваць параду Ніны. Але вось—няўдача: званок апавясціў аб заканчэнні заняткаў. У хуткім часе апусцелі аўдыторыі. Толькі вось у гэтай чамусьці шмат студэнтаў. Знаёмімся. Аказваецца, гэта студэнты МДУ Мацкевіч, Семашкевіч, Сцяпанаў, студэнтка Вільнюскага універсітэта—І. Латынская, студэнтка Адэскага ўніверсітэта І. Цалуйка, студэнткі нашага універсітэта Н. Каплунова, О. Аўсіевіч, выкладчыца рускай літаратуры З. С. Мелкіх. Праз некалькі хвілін пачнецца XXII студэнцкая навуковая канферэнцыя, і вось яны сабраліся тут, каб яшчэ раз параіцца паміж сабой наконт сваіх дакладаў. У канферэнцыі прымаюць удзел як нашы студэнты, так і студэнты з шасці другіх універсітэтаў краіны. На ніжнім здымку вы бачыце іх.

Больш 20 дакладаў было прачытана на гэтай канферэнцыі. Нашым ды і ўсім удзельнікам канферэнцыі спадабаліся даклады студэнта МДУ Валодзі Сцяпанава «Вобраз Леніна ў сучаснай савецкай літаратуры», нашых студэнтак В. Януковіч «Назіранні над мовай роднай вёскі Заборцы Глыбоцкага раёну» і О. Аўсіевіч «Беларускія народныя песні вёскі Дзянісовічы Крупскага раёна. Як бачым, і тут не абыйшліся без песень...


(Працяг на 3-й стар.).






## ДАСТОЙНАЕ ПАПАЎНЕННЕ

Звычайна ў красавіку, калі ўсё прагрэсіўнае чалавецтва рыхтуецца святкаваць міжнародны дзень салідарнасці ўсіх працоўных свету Першае Мая, у партарганізацыі факультэтаў нашага універсітэта ўзрастае паток заяў аб прыёме ў члены КПСС. Выкладчыкі, студэнты, служачыя просяць прыняць іх у рады Камуністычнай партыі, каб камуністам змагацца за тыя вялікія ідэі, стваральнікам якіх быў Уладзімір Ільіч Ленін.

Толькі на адным гістарычным факультэце напярэдадні Першага Мая былі прыняты ў партыю студэнты першага курса М. Бельскі, В. Дубаў, кандыдатамі ў члены КПСС выкладчык І. І. Даўгаеў. Сваімі адносінамі да працы, выдатнымі паводзінамі ў калектыве яны заслужылі вялікі гонар быць камуністамі. Партыйная арганізацыя БДУ імя У. І. Леніна атрымала дастойнае папаўненне.

Ул. БЛАКІТНЫ.

5-га

М

**РАБОТНІКІ ДРУКУ, РАДЫЁ І ТЭЛЕБАЧАННЯ, ВЫДАВЕЦТВАЎ І КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫХ УСТАНОЎ! АКТЫЎНА ДАПАМАГАЙЦЕ ПАРТЫІ ВЫХОЎВАЦЬ ПРАЦОЎНЫХ У ДУХУ МАРКСІЗМА-ЛЕНІНІЗМА, САВЕЦКАГА ПАТРЫЯТЫЗМУ І ПРАЛЕТАРСКАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМУ!**

**(З ЗАКЛІКАЎ ЦК КПСС ДА 1 МАЯ).**

# ГАЗЕТА—БЕЗ ПАПЕРЫ

Так назваў Ул. І. Ленін радыё.

стаў. Аб гэтым сведчаць шматлікія

# НАШ СТУДКОР



У кастрычніку 1961 года студэнты першага курса геафака пабывалі на экскурсіі ў дарагім кожнаму савецкаму чалавеку доміку на плошчы Перамогі ў Мінску. У 1898 годзе тут ад-

# Май студэнцкі



Працяг.

На біялагічным факультэце над рознымі апаратамі, колбамі і прабіркамі схіліліся студэнты. Ідуць лабараторныя заняткі. Студэнты так заняліся сваёй работай, што, вось бяда, на нас паглядзелі толькі вось гэтыя дзве дзяўчыны, якіх вы бачыце на здымку. Справа— Люда Сысоева, злева — Лена Жарміцына. Яны першакурснікі вячэрняга аддзялення. Паспяваюць яны вучыцца і працаваць. І галоўнае—усюды адносяцца да сваёй справы са стараннем, радасцю. Іх твары, як вы бачыце на здымку, сур'ёзныя. Апошняя лабараторная работа, а пасля — сесія. Пасля мы даведаліся, што гэтую работу яны выканалі на «выдатна». Што ж, падарунак Першамаю нядрэнны.

Спускаемся паверхам ніжэй і накіроўваемся ў бібліятэку. За крайнім сталом сядзяць Анатоль Гарбачоў і Іра Шумко. Яны ўважліва прачытваюць адну за другой старонкі падручніка. Пачынаецца сесія. Тэрміновая экзаменацыйная сесія. Ім хутка ў дарогу. Гэта ж цаліннікі. Мы пажадалі ім на «выдатна» здаць сесію, добрых поспехаў у наступаючым будаўнічым семестры.

Многа студэнтаў займалася ў бібліятэцы. Сярод іх мы ўбачылі і студэнта падрыхтоўчага факультэта Генры Аппіа. Да нас ён прыехаў з Ганы. І ніколі не развітваецца ён вось з гэтай кніжкай, за якой мы і сфатаграфавалі яго. Пакуль што ён ведае толькі некалькі рускіх слоў. Але пройдзе час— ён вывучыць рускую мову і вернецца дадому з добрым багажом ведаў, атрыманых у нашай краіне! І, вядома, ён ніколі не забудзецца аб Мінску, універсітэце і шматлікіх савецкіх сябрах.

Заканчэнне на 4-й стар.





* * *

П. ЛІПАН.

Там, на захадзе, за полем,
Дзе звужаецца абшар,
Сонца спаць лягло паволі
У калыску белых хмар.
Толькі ж выплыве задумны
Човен-месяц на ваду —
Перапраўлюся бясшумна
На той бераг — і пайду...
Там, у вёсцы, — добра
знаю! —
Не засне ніяк яна,
Крокаў сцішаных чакае
Ля адкрытага акна.

Ул. ДЗЮБА.

*У кашулі расквечанай*
*Ходзіць май.*
*Маці,*
*вечарам*
*Не трымай.*
*Бо між навальніцаў*
*Уначы*
*Яна не баіцца*
*Касу змачыць.*
*Ну,*
*а выхапіць з ножнаў*
*Пярун клінок.*
*Скажу:*
*«Няможна!*
*Маўчы, браток!..»*
*Сэрца хлапечае*
*Апячэ*
*Харошы, вечны*
*Погляд вачэй.*
*Дык,*
*маці,*
*вечарам*
*Не трымай.*
*У сукенцы расквечанай*
*Ходзіць май!..*

С. ЗАКОННІКАЎ.

**Апошні снег стапталі птушкі,**
**Устрапянуўся сонны бор.**
**Вятры сасну люляюць,**
**гушкаюць,**
**Кідаюць аж да самых зор.**
**Яна ўзняла галіны ўгору:**
**«Шчаслівы шлях, зіма!**
**Бывай!**
**На сцежцы**
**басанож**
**я скора**
**Сустрэну летуценны май!..»**

# КУБА ПЕРШАМАЙСКАЯ

Нядаўна правадыр кубінскай рэвалюцыі Фідэль Кастра выступіў з гарачай прамовай, звернутай да мужнага кубінскага народа. Фідэль Кастра гаварыў пра кубінскіх патрыётаў мінулага стагоддзя, аб тым, як яны змагаліся за свабоду Кубы. Ён выказаў думкі шматмільённага кубінскага народа, яго абурэнне супраць падкопаў агрэсараў.

Напярэдадні 1 Мая кубінскі народ яшчэ мацней згуртуе свае рады ў барацьбе за свабоду і волю, супраць імперыялістычных агрэсараў. Вялікая любоў кубінскага народа да Радзімы аб'ядноўвае намаганні кубінцаў у барацьбе за свабоду.

Улічваючы важнасць рэвалюцыйнага мінулага, кубінскі народ з новымі сіламі і вялікім вопытам рэвалюцыйнай барацьбы ідзе наперад, да дасягнення светлай мэты на шляху будаўніцтва сацыялістычнага грамадства на востраве Свабоды.

Кубінскі народ рыхтуецца сустрэць міжнародны дзень салідарнасці працоўных — 1 Мая новымі поспехамі ў працы, яшчэ мацнейшым згуртаваннем радоў барацьбітоў за мір, нястрымнай воляй да перамогі ў імя шчаслівага заўтра.

Барыс ЛА СЕРНА.

# Афрыканскае сэрца

Афрыканскі кантынент падобен на сэрца, а сэрца б'ецца ў грудзях кожнага чалавека. Мы далёка ад радзімы толькі па адлегласці, але яна ў душы кожнага афрыканца. У нашым сэрцы. Яе палі, горы, рэкі, думкі яе народа, яго надзеі — усхвалявана гучаў у цішыні актавага зала універсітэта голас Роберта Кейге, студэнта палітэхнічнага інстытута.

— Мы сёння ў кругу сваіх савецкіх сяброў святкуем свята — Дзень Афрыкі, а з намі, мы ведаем, святкуе ўвесь савецкі народ.

Бурная хваля апладысментаў пацвердзіла яго словы. У гэты дзень не толькі ў сценах універсітэта гучалі афрыканскія песні, яны гучалі і ў многіх клубах горада. А студэнты ўніверсітэта сталіся зрабіць усё магчымае, каб іх сябры-афрыканцы адчулі сябе, як родныя, на нашай зямлі.

А. ТАБАЧНІКАЎ.

# ПЕРШЫ МАЙ У МІХАЛІНСКАЙ ПУШЧЫ

**На сотні кіламетраў раскінуліся Міхалінскія лясы. Вякамі стаіць апеты легендамі і народнымі песнямі бор. Старажылы расказваюць, што ў былыя часы мядзведзі прыходзілі да пасечнікаў у «госці» пакаштаваць свежага мёду. Дзічына не ўмяшчалася ў гэтых лясах...**

**У гады Вялікай Айчыннай вайны дзесяткі маленькіх і вялікіх партызанскіх атрадаў прыняла Міхалінская пушча пад сваю ахову. Лес быў свайго роду базай брэсцкіх, пінскіх і беластоцкіх партызан. Пушча нагадвала вялікі муравейнік. З раніцы да позняга вечара ішла баявая падрыхтоўка: вучыліся стральбе, кіданню гранат, падрыўной справе. Пасля партызанскія атрады ішлі на заданні, на засады і зноў вярталіся на базу. Усіх укрылі Міхалінскія лясы і ўсім знаходзілася там месца.**

**Першага Мая 1943 года я знаходзіўся ў Міхалінскай пушчы. Напярэдадні свята самалёты з «Вялікай зямлі» прывезлі нам «гасцінцы» — патроны, гранаты і ўзрыўчатку. У падраздзяленнях праводзіліся гутаркі аб Першым Маі, партызаны бралі канкрэтныя абавязацельствы. А на досвітку пачалося...**

**На дзесяткі кіламетраў вакол лесу ішлі цяжкія баі з ворагам. Ляцелі пад адкос варожыя эшалоны, знішчаліся фашысцкія гарнізоны, на дарогах падрываліся аўтамашыны. Адным словам, тут, за сотні кіламетраў ад лініі фронту, шугала полымя вайны.**

**Партызанская брыгада імя Чапаева, у якой я служыў, зрабіла засаду на шашы Ружаны—Пружаны. Гітлераўцы ведалі, што недзе ў гэтым раёне знаходзяцца значныя партызанскія сілы, таму пры пераходзе з Ружан у Пружаны яны прынялі неабходныя меры перасцярогі.**

**У самым пачатку праходзілі паліцэйскія падраздзяленні, а каля васьмі гадзін раніцы лянівым маршам прайшла пяхота. Мы прытаіліся за 100—150 метраў ад дарогі. Пяхоту прапусцілі... Праз хвіліну ў ахутанай пылам дарозе паказаліся машыны. Мінута, другая... і раптоўная траскатня нашых кулямётаў і аўтаматаў змяняецца разрывам гранат і мін. Цёмна-зялёныя мундзіры шукалі ратунку, кідаліся на абочыну дарогі, беглі назад з гэтага нечаканага пекла.**

**У гэтым баі было забіта 70 гітлераўскіх салдат і 132 паранена.**

**Сонца ўжо стаяла ў зеніце, калі партызаны вярнуліся ў свой лагер. А вечарам яны наладзілі першамайскі баль.**

**І. ЗАЗЕКА.**

# ВЕЧАР ДРУЖБЫ

**У актавай зале сабраліся студэнты БДУ, якія разам са студэнтамі-малійцамі падрыхтоўчага факультэта вывучаюць французскую мову. Пасля кароткага даклада аб нацыянальна-вызваленчым руху ў Афрыцы студэнта Вінакурава (гістфак), студэнт-маліец расказаў аб барацьбе і стваральнай працы ў Малі.**

**У канцэрце мастацкай самадзейнасці ўдзельнічала каля 50 студэнтаў усіх асноўных факультэтаў, а таксама студэнты-малійцы. Было многа спеваў, сцэнак, вершаў, некаторыя спевы выконваліся разам студэнтамі беларусамі і малійцамі. Пазнаёміліся на гэтым вечары таксама з самабытным мастацтвам Малі, іх спевамі, танцамі, народнымі інструментамі.**

**Добра правялі канферанс студэнты Бяндэрскі (фізфак) і Мусіч (гістфак). Усё выконвалася на французскай мове. У заключэнне ўдзельнікі самадзейнасці разам з усімі прысутнымі стоячы выканалі гімн дэмакратычнай моладзі.**

**Добрую справу зрабіла кафедра французскай мовы (заг. Полазаў Н. М.). Сваім прыкладам яна паказала, што можна зрабіць для выхавання і адпачынку студэнтаў, калі з душой папрацаваць і не шкадаваць часу.**

**А. НАХІМОЎСКАЯ.**

# ПОДЫХ ВЯСНЫ

Яшчэ не паспела прабіцца зеляніна дрэў, а палявая дарога пыліць ужо. Але вось-вось з часу на час лопнуць у начной цішы набрынялыя почкі. Ужо дзесьці на лясных палянах бялеюць першыя падснежнікі, загусцілася маладая сакавітая трава. І менавіта ў гэтую сонечную пару веснавая маладосць прыроды запрашае да сябе маладых. Іх можна сустрэць усюды: у палях за горадам, у парках і скверах, на вуліцах і плошчах.

Для першакурснікаў сёлетняя вясна — гэта першая студэнцкая вясна, гэта вясна іх жыцця, іх маладосці! І наўрад ці ў гэтыя сонечныя майскія дні хто-небудзь застанецца сядзець дома, застанецца някранутым вясновай радасцю. Вясна любіць прастор. Яна не прывыкла сядзець у чатырох замкнутых сценах. Вясна—гэта тое ж самае полымя, якое палыхае на ветры аксамітам зеляніны. Яна ніколі не тлее, а гарыць, як вечная нестарэючая маладосць чалавека. Такой і застанецца ў сэрцах першакурснікаў першая іх студэнцкая вясна, увасабленне маладосці і жыццярадаснасці.

**К. МОХАР,**
**студэнт аддзялення журналістыкі.**



# МАЙ СТУДЭНЦКІ

(Заканчэнне)



Студэнцкае жыццё кіпіць не толькі ў бібліятэках, аудыторыях, але і там, дзе жывуць студэнты. Па дарозе ў інтэрнат мы сустрэлі ўдзельнікаў традыцыйнага вясенняга кроса. Гэта студэнты матэматычнага факультэта. Першы спартыўны старт, і першая спартыўная радасць. Яны занялі прызавое месца.

Надыходзіў вечар. Вузкая сцежка ўздоўж ракі вядзе нас у інтэрнат. Каля бярозы стаяць двое закаханых: студэнт і студэнтка. І ў гэты час наш фотаапарат шчоўкнуў затворам. Мо і для іх стане такой жа шчаслівай вясна, як і для гэтых студэнта і студэнткі, якіх мы зафатаграфалі ў час вяселля.

**А. КАДЗЕТ,**
**В. АДЗІЯН,**
**студэнты аддзялення журналістыкі.**
Фота **аўтараў.**



# НА ПРЫЗ ФІЗФАКА

Бадай, яшчэ ніколі не было так мнагалюдна ў спартыўнай зале хімкорпуса, як цяпер. Сюды сабраліся спартсмены з розных факультэтаў універсітэта, каб памерацца сілай на дыване. Адбывалася асабістае і каманднa-асабістае першынство горада Мінска на прыз фізфака. Для ўдзелу ў спаборніцтвах прыйшлі барцы вольнага стылю з іншых вну.

Нямала сабралася спартсменаў і балельшчыкаў. Адны ставілі свае прагнозы, другія спрачаліся — хто будзе чэмпіёнам? Аным словам, ішла жывая гутарка, у якой удзельнічалі ўсе. Але вось закончыліся спрэчкі. Суддзі занялі свае месцы за судзейскім сталом. Усе прыціхлі ў чаканні пачатку спаборніцтва. І вось першы свісток суддзі парушае цішыню — паядынак па вольнай барацьбе пачаўся.

На дыване барцы найлягчэйшай вагі. Абодва першакурснікі. Моцнай схваткай схапіліся яны, кожны хоча быць пераможцам. Бурнымі апладысментамі ўсе прысутныя адзначылі першую перамогу ў гэтых спаборніцтвах. Суддзя падняў руку Мікалая Саўкіна.

А праз некалькі хвілін гаспадарамі дывана сталі барцы лягчэйшай вагі. Пра першаразрадніка першага курса філалагічнага факультэта Сцяпана Лаўшука заўсёды адзываліся з цяплом спартсмены і балельшчыкі. І на гэты раз ён не падвёў іх давер'е. Забягаючы наперад, скажу, што на гэтых спаборніцтвах ён атрымаў некалькі бліскучых перамог над сваімі сапернікамі. Сябры цёпла павіншавалі Сцяпана Лаўшука. У сваёй вагавой катэгорыі ён заняў першае месца па універсітэту.

Абрадаваў у час спаборніцтваў і другі першакурснік філалагічнага факультэта Васіль Літвінка. У яго яшчэ няма спартыўнага разрада, але гэта не перашкодзіла яму атрымаць тры перамогі. Прайграў толькі адну схватку. Гэта фізічна выхаваны спартсмен. І калі цяпер ён заняў трэцяе месца, то ў наступнае спаборніцтва, ёсць надзея, што Васіль Літвінка зойме першае.

Па-майстэрску правёў бой і Рыгор Шэндзікаў з біялагічнага факультэта. Спіс паядынкаў можна зрабіць доўгі, але хочацца адзначыць іншае — масавасць. І многае ў гэтым трэба аддаць трэнеру па вольнай барацьбе Е. Г. Стралецкаму. З поўнай упэўненасцю можна сказаць, што вольная барацьба заняла ганаровае месца ў спартыўным жыцці універсітэта. Найбольш паспяхова выступіла каманда першага курса матэматычнага факультэта. Ёй і ўручылі прыз фізфака.

Па цяжкай барацьбе ўдзельнікаў было менш. А. Астрэйка, С. Лаўшук, Г. Шэндзікаў сталі чэмпіёнамі Мінска. Малайцы, хлопцы, з перамогай вас!

# ВЫСТУПАЮЦЬ МАЛАДЫЯ ВУЧОНЫЯ

На днях у гуманітарным корпусе працавала секцыя беларускай і рускай мовы навуковай канферэнцыі маладых вучоных універсітэта. З дакладамі выступілі выкладчыкі філалагічнага факультэта І. М. Шчарбовіч, Я. М. Камароўскі, Ул. М. Лазоўскі, М. І. Сыракваш, М. З. Міхей, аспіранты М. А. Корчыц, З. А. Ляксуціна, лабарантка кабінета беларускай мовы І. А. Каралёва. Усяго прачытана 14 дакладаў. Тэматыка іх ахоплівала важнейшыя пытанні гісторыі сучаснай літаратурнай беларускай мовы, пытанні культуры мовы. У спрэчках па дакладах выступілі вядучыя выкладчыкі-моваведы прафесар М. А. Жыдовіч, дацэнты М. І. Жыркевіч, А. Я. Бірала, Л. М. Шакун, В. Ф. Крыўчык.

У рабоце секцыі прынялі ўдзел навуковыя супрацоўнікі Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР і аспіранты Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага.

**А. ШЫКАЛОВІЧ,**
**аспірант, сакратар навуковай секцыі.**

# ТАК ПРЫХОДЗІЦЬ МАЙСТЭРСТВА

Раніцай, як і ўсе студэнты, ён спяшаецца на лекцыі. У яго руках напоўненая кніжкамі і канспектамі сумка. Гэта студэнт першага курса Саша Тараканаў. На фізічным факультэце яго ведаюць многія. Пра яго кажуць: «Сціплы, добры таварыш, вучыцца добра».

Вось ужо недалёка універсітэт, сустракаюцца знаёмыя аднакурснікі і чуваць: «Прывет, Саша!»—здароўкаюцца хто за руку, хто проста так. Хлопцы адразу ж заводзяць гаворку аб уражаннях мінулага дня, ну, вядома, і аб лекцыях не прамінуць пагаварыць. Вясёлы народ гэтыя студэнты, чуць якое здарэнне — гарачыя спрэчкі. Так і трэба. Саша сёння чамусьці больш слухае, гаворыць мала, нешта непакоіць хлопца. Цяпер жа ў яго многа спраў. Пасля заняткаў ён пойдзе ў спартыўную залу і папросіць трэнера па гімнастыцы дазволу займацца ў секцыі...

— Але ці прымуць, — думаў Саша. — Няўжо трэнер не зразумее, што я люблю гімнастыку і хачу па-сапраўднаму заняцца ёю...

Думкі яго перарываюцца: не заўважыў, як апынуўся ў галоўным корпусе універсітэта.

У гэтую раніцу званок празвінеў, як звычайна, у дзевяць. Пачаўся цяжкі творчы дзень. Так ён цягнецца да апошняга званка...

І зноў у руках сумка. Саша ідзе дадому. Час цягнецца павольна-павольна, ледзь дачакаўся вечара. А пасля накіраваўся ў спартыўную залу. І хваляванне ўлеглося, калі пачуў ад трэнера:

— Возьмем у секцыю.

З таго дня і пачалося яго спартыўнае жыццё...

У рад выстраіліся гімнасты па камандзе трэнера. Нібы салдаты, чотка выконваюць яны каманду: «Раўняйся», «Смірна». Пачынаецца размінка, спартыўная зала зноў ажывае — рабочы дзень секцыі пачаўся. Пасля наступае самае галоўнае — практыкаванне на снарадах. Нясмела адчуваў сябе Саша спачатку. Пасля адчуў сяброўскі локаць таварышаў, іх дапамогу. Так у іх хутка стварылася дружная спартыўная сям'я. Жыць стала весялей, хутка праходзілі дні, тыдні, месяцы. Саша на выдатна выконваў цяпер амаль усе практыкаванні на снарадах. На душы неяк прыемна ад гэтага. А зусім нядаўна самому было смешна. Часам успамінаўся адзін з многіх выпадкаў:

Сядзеў ён на лаве, побач таварышы-гімнасты, якія чакалі сваёй чаргі выконваць практыкаванні. Вядома, не ва ўсіх аднолькава атрымлівалася, бо ў секцыі былі новенькія і ўжо сталыя спартсмены. Сашу вельмі падабалася, як выконвае складаныя практыкаванні другаразраднік Юрый Старцаў. І вось трэнер выклікае яго. Паспрабаваў — не атрымалася. Гэта выглядзела вельмі смешным, ды хлопцы не смяяліся. Пасля яны ўсе разам дапамагалі яму, падказвалі, як лепш выканаць тое ці іншае практыкаванне на снарадзе. Хутка будуць праводзіцца спаборніцтвы па універсітэту. У іх будзе прымаць удзел і Саша Тараканаў. Гэта і будзе яго экзамен на спартыўную сталасць.

Вось так і пачынаецца шлях да майстэрства. Шлях гэты цяжкі і ісці па ім могуць толькі працавітыя, моцныя духам людзі. Цяпер Саша многа трэніруецца, прыглядаецца да таго, як выконваюць складаныя практыкаванні вопытныя гімнасты. Як хочацца быць такім, як яны. Верыць у свае сілы Саша, але ўсё ж задумваецца іншы раз: «Ці буду такім?»

І тут мне хочацца адказаць за яго: «Будзеш, Саша, абавязкова будзеш».

**Ю. АГАРАДНІЧЭНКА,**
**студэнт аддз. журналістыкі.**

Рэдактар П. П. СІЛІВАНЧЫК.

АТ 01918. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19. Друкарня Выдавецтва «Звязда» Тыр. 2000. Зак. № 506.